Падтрымай "Вясну" на PATREON

Звароты ў суд і ў міліцыю не дапамаглі: Паўлу Левінаву прысудзілі арышт на 15 сутак

18.04.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Павел Левінаў

У адсутнасць віцебскага праваабаронцы 17 красавіка завяршыўся працэс над **Паўлам Левінавым** у Кастрычніцкім райсудзе Віцебска. Паводле падзеяў 25 і 26 сакавіка, суддзя **Іна Грабоўская** абвінаваціла Паўла Левінава ў парушэнні парадку правядзення масавых акцый. Пра гэта паведаміла прэс-служба БАЖ.

Павел Левінаў тлумачыць, што сапраўды прысутнічаў на вулічных акцыях, але абсалютна з іншай мэтай:

> *“Яшчэ 15 сакавіка я накіраваў у абласную ўправу МУС паведамленне, што назіральнікі ад РПГА БХК будуць праводзіць маніторынг масавых мерапрыемстваў у Віцебску. Атрымаў адказ ад намесніка начальніка, што паведамленне прынята да ведама, прычым мне яшчэ падзякавалі за актыўную грамадзянскую пазіцыю… А 26-га сакавіка затрымалі і склалі два пратаколы аб адміністратыўных правапарушэннях паводле артыкула 23.34 КаАП. Нібыта я выказваў свае палітычныя погляды падчас святкавання Дня волі, а назаўтра — сваё стаўленне да Дэкрэту № 3. Пасля затрымання я звярнуўся ў абласную міліцэйскую ўправу: маўляў, як у міліцыі так атрымліваецца? А мне адказалі, што дзейнасць назіральніка не з’яўляецца падставай для скасавання распачатай супраць мяне адміністрацыйнай справы. Не паўплывалі на рашэнне суддзі ні абураныя водгукі міжнародных праваабарончых структур, ні заступніцтва жыхароў Віцебска, якія сабралі 75 подпісаў за тое, каб спыніць распачаты супраць мяне судовы пераслед”.*

На судовым працэсе 17 красавіка Паўла Левінава не было. Ягоныя інтарэсы прадстаўляў родны брат Андрэй Левінаў. Ён хадайнічаў, каб суддзя перанесла працэс, але тая не пагадзілася:

Пасля затрымання 26-га сакавіка Павел трапіў у шпіталь з гіпертанічным крызам. Цяпер ён працягвае лячэнне ў Кіеве. Левінаў даслаў пісьмовую просьбу, каб суд не разглядаў справу ў ягоную адсутнасць. Але спадарыня Грабоўская не пагадзілася. Дакладней, адзін раз разгляд справы перанеслі на некалькі дзён, а другі раз адтэрмінаваць разгляд яна не захацела. Суд зрабіў запыт у паліклініку Паўла па месцы жыхарства, і адтуль адказалі, што на дадзены момант ён не лечыцца ў мясцовых установах. Гэтага суддзі падалося дастатковым, каб разглядаць справу завочна. На працэсе не было ні прафесійнага адваката — бо ў Паўла ёсць дамова з адвакатам, але ён знаходзіцца ў Літве, ні нават сведкаў-міліцыянтаў. Суддзя прачытала ліст з ГА "БАЖ", дзе гаварылася, што Павел быў на мерапрыемствах і ў якасці пазаштатнага журналіста, і ліст з рэдакцыі газеты «Витебский курьер», дзе гэта пацвярджалася. Аднак ніякай ролі гэтыя дакументы не адыгралі.

Суд прызнаў Паўла Левінава вінаватым ужо таму, што ён прысутнічаў у тым месцы, дзе сабраліся людзі. Нічога іншага два фрагменты аператыўнага відэазапісу, прагледжаныя падчас працэсу, даказаць не маглі.

Вырак суддзі Грабоўскай быў адзін у адзін падобны да ранейшых, вынесеных у дачыненні да журналістаў і праваабаронцаў — 15 сутак арышту.

Роўна столькі ж давялося адбыць віцебскім БАЖаўцам Леаніду Свеціку і Канстанціну Мардзвінцаву. 10 сутак арышту было прысуджана журналісту-фрылансеру з Оршы Арцёму Сізінцаву, чакае суду паводле падзеяў 25-га сакавіка і журналіст-фрылансер з Віцебску Сяргей Русецкі.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ


Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY